ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
19
СТУДЗЕНЯ
№ 3 (1596)

У наступным нумары чытайце:

З чаго пачынаецца шлях ва універсітэт? З падачы дакументаў? З уступных экзаменаў? Зразумела, ён пачынаецца з моманту, калі малады чалавек самастойна выбірае сваю будучую прафесію.

Апантаны светлымі марамі, ружовымі надзеямі і высакароднымі імкненнямі, абітурыент не звяртае ўвагі на штодзённыя клопаты, «чарнавы бок» абранай спецыяльнасці. А рыхтавацца да яго трэба. Як маральна, так і інтэлектуальна, каб, сутыкнуўшыся сам-насам з аб'ектыўнай рэчаіснасцю, раптам не кідацца ў роспачы ў пошуках іншага месца ў жыцці. Але ж патрэбна яшчэ даказаць сваё права на любімую справу — паспяхова здаць уступныя экзамены. Жадаем абітурыенту-89 выдатных адзнак! А дакладны і прадуманы выбар дапаможа зрабіць яму наступны «абітурыенцкі» выпуск газеты.

ФОТА Ў НУМАР



Судакрананне з вечнасцю. У лабараторыях біялагічнага факультэта яно адбываецца кожны дзень. Цікавыя і захапляючыя атрымліваюцца заняткі.

Фота С. ГРЫЦА.

ХТО РЫЗЫКУЕ...

СЛОВА «сесія» мяне не хвалюе, не пужае. Я пакуль вучуся ў школе. Таму мне проста цікава: як студэнты да сесіі рыхтуюцца? У пятай групе першага курса механіка-матэматычнага факультэта знайшла і тых, хто рыхтуецца да экзаменаў па прадметах, якія ў семестры вучыў спусціўшы рукавы, і тых, для каго сесія — толькі пачатак навучальнага года. Зразумела, апошнія вывучыць усё не паспяваюць і спадзяюцца на шчаслівы выпадак.

І здаюць сесію па-рознаму: хто — для замацавання ведаў, хто — для «галачкі» і стыпендыі. Адных сесія задавальняе такая, якая яна ёсць. Мае ж знаёмыя з пятай групы прапануюць: павялічыць працягласць сесіі, здаваць яе да Новага года (каб непрыемнасці пакінуць у старым), выключыць з вучэбнага плана экзамены па прадметах, якія цяжка зразумець, а тым больш завучыць (пакуль, на першым курсе).

Магчыма, яны памыляюцца, бо здаюць сесію ўпершыню. А вось студэнтка другога курса дзеліцца такім вопытам:

— Галоўнае, не даць выкладчыку зразумець, што ты чагосьці не ведаеш. Сам ён можа і не здагадацца. І потым, бязвыхадных становішчаў не бывае.

Што ж, такая рызыка — справа смельчакоў і аптымістаў. Я да яе пакуль стаўлюся з недаверам. А вы?

Людміла АНТУХ,
дзесяцікласніца.

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ У ДАДАТАК?

Я ЗАКОНЧЫЎ падрыхтоўчы факультэт, паступіў ва універсітэт, дзе спадзяюся атрымаць спецыяльнасць. У нас, студэнтаў, добрыя ўмовы для атрымання ведаў, лепшага вопыту, каб стаць выдатнымі спецыялістамі. На падрыхтоўчым факультэце я са сваімі сябрамі шмат вучыўся. Засталося добрае ўражанне аб інтэнсіўнай сістэме навучання ў Савецкім Саюзе. Мы не толькі навучыліся размаўляць па-руску, але і многае даведаліся аб савецкім грамадстве. Аднак вось прайшоў першы год вучобы ва універсітэце, і мы пачалі заўважаць змены ў сістэме навучання і ў інтэнсіўнасці самога працэсу. Студэнты, асабліва першага курса, звярталіся да дэкана з просьбай змяніць праграму навучання. Мы лічым, што шмат часу трацім на не вельмі патрэбныя прадметы. Вынікі? Паспяховасць замежных студэнтаў стала горшай.

Студэнты старэйшых курсаў патрабуюць больш практычных спраў, а малодшых — больш часу на прадметы, якія маюць непасрэдныя адносіны да спецыяльнасці. Напрыклад, у першакурснікаў 36 гадзін рускай мовы ў тыдзень, а тэорыі і практыкі журналістыкі, нашай спецыяльнасці,— менш 5 гадзін. Незразумела, з нас рыхтуюць журналістаў ці філолагаў?

Думаецца, такія праблемы ВНУ вырашальныя. Яны даўно наспелі. А вось ці наступяць змены? Шкада, калі не дачакаюся.

САНДЭЙ АДЭЛАДЖА,
студэнт факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

НА ПАСЯДЖЭННІ РЭКТАРАТА

прысутныя заслухалі справаздачу загадчыкаў кафедраў замежных моў аб рабоце гэтых падраздзяленняў. Асобна была звернута ўвага на недахопы, якія яшчэ нярэдка сустракаюцца ў рабоце, і меры па іх выпраўленню.

Не менш важнае пытанне — аб прыёмах і метадах актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў на факультэце радыёфізікі і электронікі.

М. АНДРЭЕЎ.

●

ДОБРА ПРАВЕСЦІ ВОДПУСК

і адпачыць дапаможа Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік». Яно прапануе да вашых паслуг маладзёжна-турыстычныя цэнтры:

«Спадарожнік» (Сочы) — з 27.01 да 9.02 (7 пуцёвак); з 11.02 да 24.02 (2); з 26.02 да 13.03 (2) і з 15.03 да 30.03 (4).

«Наарус» (Эстонская ССР. Балтыйскае мора) — з 7.02 да 21.02 (1 пуцёўка).

«Гянджлік» (Азербайджанская ССР. Каспійскае мора) — з 24.02 да 9.03 (1 пуцёўка).

«Жамчужына» (Маскоўская вобл.) — з 27.01 да 9.02 і з 27.02 да 13.03 — па адной пуцёўцы.

Размяшчэнне ў цэнтрах — па два-тры чалавекі. Да паслуг моладзі — канцэртныя залы, бібліятэкі, спартыўныя пляцоўкі. У культурнай праграме работы турыстычных цэнтраў — тэатралізаваныя прадстаўленні, вясёлыя конкурсы, балі, дыскатэкі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, спартыўныя спаборніцтвы.

«Спадарожнік» кліча ў дарогу!

Чакаем вас. Тэлефануйце па тэл. 20-33-30, 20-84-19, заходзьце на адрас: г. Мінск, праспект Дзяржынскага, 10, пакой 103.

МАСКОЎСКІ РК ЛСКМБ.

●

ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»

запрашае вас на лекцыю «Палітычныя партрэты (Сталін, Троцкі, Бухарын, Рыкаў). Лектар — кандыдат гістарычных навук, дацэнт Г. А. Космач. Лекцыя адбудзецца сёння а 19-й гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ.

З. МІХНЕВІЧ.

СПАДЧЫНА: ЁСЦЬ КАНКРЭТНЫЯ ПРАПАНОВЫ

АД СЛОЎ — ДА СПРАВЫ

З другой паловы лютага гэтага года ва універсітэце мяркуецца адкрыццё паўтарагадовых курсаў беларусазнаўства. Іх стварэнне павінна стаць адной з практычных мер па развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці ў нашым універсітэце. Ініцыятарамі выступаюць рэктарат, партком, факультэт грамадскіх прафесій, камітэт камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

У рамках курсаў плануецца работа аддзялення мовазнаўства і аддзялення гісторыі і культуры Беларусі. Чытаць лекцыі і праводзіць практычныя заняткі будуць лепшыя супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты старэйшых курсаў універсітэта, буйнейшыя вучоныя і спецыялісты іншых навучальных і навукова-даследчых арганізацый і ўстаноў Беларусі. Навучанне на курсах — бясплатнае. Заняткі плануецца праводзіць у вячэрні час адзін раз у тыдзень — для кожнага аддзялення — па чатыры акадэмічныя гадзіны. Для тых, хто займаецца на абодвух аддзяленнях гэта складзе восем акадэмічных гадзін у тыдзень.

З мэтай максімальнага ўліку думак і пажаданняў усіх зацікаўленых бакоў і асоб прапануем для абмеркавання праекты праграмы заняткаў аддзялення гісторыі і культуры і аддзялення мовазнаўства.

ПРАЕКТ ПРАГРАМЫ

аддзялення гісторыі і культуры курсаў беларусазнаўства БДУ імя У. І. Леніна

1. Уводная лекцыя: К. Маркс і Ф. Энгельс аб Беларусі.

I. Дакастрычніцкі перыяд

2. Беларусь у найстаражытнейшыя часы (да IX ст.).
3. Беларусь у раннім сярэднявеччы (аглядная лекцыя).
4. Усяслаў Чарадзей.
5. Ефрасіння Полацкая і культурна-гістарычны працэс у Полацкім княстве.
6. Знешнепалітычныя адносіны Полацкага княства (IX—XIII ст. ст.).
7. Турава-Пінскае княства (IX—XIII ст.ст.).
8. Старажытная (гістарычная) Літва: факты і домыслы.
9. Круглы стол: «Утварэнне Вялікага княства Літоўскага».
10. Круглы стол: «Існаванне Старажытнарускай народнасці. Утварэнне беларускай народнасці».
11. Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім у XIV—XV ст.ст.
12. Кніжная культура Беларусі (XIV—XVI ст.ст.). Летапісы.
13. Беларусь у знешняй палітыцы Вялікага княства Літоўскага (XIV—XVIII ст.ст.)
14. Круглы стол: «Залаты век» на Беларусі (факты, меркаванні)».
15. Аграрна-эканамічнае развіццё Беларусі ў XIV—XVII ст.ст.
16. Гарады Беларусі XV—XVII ст.ст. (знешні выгляд, побыт насельніцтва Магдэбургскае права і інш.).
17. Люблінская унія.
18. Адраджэнне на Беларусі (XVI—XVII ст.ст.).
19. Статуты Вялікага княства Літоўскага.
20. Беларускія асветнікі (Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі і інш.).
21. Войны XVI—XVII ст. ст. і дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі.
22. Рэлігійная сітуацыя і барацьба на тэрыторыі Беларусі (XIV—XIX ст.ст.). Уніяты.— 2 заняткаў.
23. Сялянства Беларусі ў XVIII ст.
24. Беларуская шляхта (гістарычная псіхалогія).
25. Беларускае выяўленчае мастацтва (XIV—XVIII ст.ст.).
26. Круглы стол: «Беларусь і Расія: эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі XIV—XVIII ст.ст.».
27. Выхадцы з Беларусі — дзеячы культуры, навукі, удзельнікі палітычнага жыцця іншых народаў.
28. Уваходжанне Беларусі ў склад Расіі: палітычная і эканамічная неабходнасць, альтэрнатыва.
29. Шляхецкія паўстанні ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.ст.
30. Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г.
31. Паўстанне 1863 года на Беларусі. К. Каліноўскі.
32. Народнікі на Беларусі. «Гоман». Ф. Багушэвіч.
33. Мінск у XIX — пачатку XX ст.ст.
34. Станаўленне беларускай нацыі. Адраджэнцкі рух на Беларусі. «Наша ніва».

II. Савецкі перыяд

35. Круглы стол: «Нацыянальнае пытанне ў Беларусі (1917—1922 гг.). Нараджэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці».— 2 заняткаў.
36. Палітычныя партыі і групоўкі ў Беларусі (1917—1925 гг.).
37. Нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў Беларусі (1921—1929 гг.).
38. Круглы стол: «Палітыка «беларусізацыі»: факты і меркаванні».
39. Індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі (шляхі, метады, альтэрнатыва). — 2 заняткаў.
40. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 30-я гады. Культурная рэвалюцыя.
41. Фарміраванне, палітычная дзейнасць і лёс беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі ў 20—30-я гады.
42. Заходняя Беларусь: старонкі гісторыі (1921—1939 гг.).
43. Круглы стол: «Заходняя Беларусь: лёс рэвалюцыйнага руху».
44. Беларусы ў заходнееўрапейскім руху Супраціўлення.
45. П.М. Машэраў як палітычны дзеяч.
46. Беларуская эміграцыя: мінулае і сёння.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

47. Неформалы: факты і домыслы.
48. Круглы стол: «Беларусь ва ўмовах перабудовы».

ПРАЕКТ ПРАГРАМЫ
заняткаў мовазнаўчага аддзялення курсаў беларусазнаўства БДУ
імя У. І. Леніна

Лекцыйны курс

1. Беларуская літаратурная мова — найважнейшы сродак нацыянальнай культуры.
2. Беларуская літаратурная мова ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму роднасных моў.

Ад слоў — да справы

3. Гісторыя беларускага пісьма. Кірыліца, лацінка, аль-кітабы.
4. Мова Вялікага княства Літоўскага.
5. Беларускае Адраджэнне. Францыск Скарына.
6. Моўная рэформа 30-х гадоў.
7. Палітыка беларусізацыі як рэалізацыя ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР.
8. Лексічнае багацце беларускай мовы.
9. Беларускія дыялекты і говоры.
10. Асаблівасці фарміравання беларускай тэрміналагічнай лексікі.
11. Беларуская фразеалогія.
12. Беларускі тапанімічны ландшафт.
13. Моўная перспектыва чалавецтва.

Практычныя заняткі

1. Фанетычная сістэма беларускай мовы і яе асаблівасці: а) агульныя рысы ўсходнеславянскіх моў; б) фанетычныя асаблівасці беларускай мовы: дзеканне і цеканне, зацвярдзелыя зычныя, фрыкатыўны гук «г», пераход «яа» і «ія» у «ў», прыстаўныя зычныя і галосныя, аканне і яканне, падаўжненне зычных, спецыфічныя чаргаванні і інш.
2. Арфаэпія зычных гукаў: а) вымаўленне і якасць асобных зычных гукаў; б) вымаўленне падоўжаных зычных; в) вымаўленне спалучэнняў зычных; г) звонкія зычныя на канцы слова; д) звонкія зычныя перад глухімі; е) глухія зычныя перад звонкімі; ж) губныя зычныя на канцы слова і перад й; з) губныя перад нацыскнымі ё, я і інш.
3. Арфаэпія галосных гукаў: а) вымаўленне націсных галосных; б) вымаўленне ненацісных галосных; в) вымаўленне некаторых спалучэнняў галосных.
4. Кантрольнае чытанне.
5. Сучасная беларуская арфаграфія: а) суадносіны паміж гукамі і літарамі; б) прынцыпы беларускай арфаграфіі.
6. Правапіс зычных: а) абазначэнне звонкасці і глухасці зычных; абазначэнне мяккасці зычных; б) правапіс д і т, дз і ц; в) правапіс прыстаўных зычных; г) абазначэнне на пісьме раздзельнага вымаўлення зычнага з наступным галосным і інш.
7. Правапіс галосных: а) галосныя е, о ў ненацісных складах; б) правапіс некаторых злучэнняў галосных.
24. Пераклад са слоўнікам.
25. Слоўнікавы склад беларускай мовы, яго састаў і развіццё. Беларуская лексікаграфія: а) сістэмнасць лексікі; б) слова як асноўная моўная адзінка; в) асноўныя тыпы лексічных значэнняў слова; г) адназначныя і многазначныя словы; д) тыпы беларускіх слоўнікаў.
26. Тыпы міжслоўных семантычных сувязей і асацыяцый іх праўлення ў лексічнай сістэме беларускай мовы: а) сінонімы; б) антонімы; в) амонімы і паронімы; г) лексіка-семантычныя групы.
27. Руска-беларуская лексічная інтэрферэнцыя.
28. Работа са слоўнікамі.
29. Стылістычная дыферэнцыяцыя і стылістычныя рэсурсы беларускай лексікі: а) нейтральная лексіка; б) кніжная лексіка; в) вусна-размоўная лексіка; г) стылістычныя пласты моўных сродкаў сучаснай беларускай мовы. Работа са слоўнікамі.
30. Паняцце аб функцыянальных стылях. Месца вобразна-выяўленчых сродкаў сродкі стылістычных рэсурсаў мовы. Творчая работа.
31. Тэрміналагічныя сістэмы асобных галін навукі.
32. Пераклад спецыяльных тэкстаў з рускай мовы на беларускую.
33. Фразеалагізмы як адзінкі мовы. Беларуская фразеалогія: а) класіфікацыя фразеалагізмаў; б) прыказкі, прымаўкі, крылатыя словы, афарызмы, перыфразы; в) пераклад фразеалагізмаў; г) фразеалагічныя слоўнікі.
34. Правільнасць мовы як асноўная яе якасць: а) норма і кадыфікацыя ў беларускай мове; б) гістарычная зменлівасць і рухомасць моўных норм; в) варыянтнасць норм.
35. Прычыны парушэння моўных норм. Правільнасць мовы і мастацкая літаратура.
36. Культура мовы і мастацкі пераклад: а) функцыі мастацкага перакладу; б) пераклад ва ўмовах руска-беларускай моўнай блізкасці; в) даслоўны пераклад; г) аўтарскі (творчы) пераклад.
37. Пераклад тэкстаў розных стыляў з рускай мовы на беларускую.
38. Кантрольны пераклад.

Мы чакаем ад вас канкрэтных прапаноў і заўваг не толькі па гэматыцы лекцый і тых асобах, якія маглі б іх прачытаць, але і думак наконт арганізацыі і работы курсаў у цэлым: найбольш зручнага дня правядзення заняткаў, іх форма, метады замацавання і ацэнкі засвоеных ведаў. Магчыма, ёсць сэнс дапоўніць традыцыйныя формы работы курсаў дзелам у арганізацыі і праяўленні беларускіх нацыянальных абрадаў і звык, адраджэнні такіх нацыянальна-культурных феноменаў, як беларускі народны тэатр лялек (батлейка) і г. д. Асабліва спадзяёмся мы на зацікаўлены ўдзел у абмеркаванні праектаў праграм курсаў кафедраў гістарычнага і філалагічнага факультэтаў.

У той жа час пажадана было б вызначыць тых людзей, якія маглі б аказаць дапамогу ў вырашэнні шэрагу арганізацыйных пытанняў па стварэнню курсаў беларусазнаўства з выхадам, у перспектыве, на стварэнне універсітэцкага Цэнтра па вывучэнню і прапагандзе беларускай культуры.

Свае прапановы, пажаданні і заўвагі просім аператыўна накіроўваць у рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт», у камітэт камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў (аўдыторыя 306 галоўнага корпуса). Спадзяёмся на вашу зацікаўленасць і падтрымку.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ГРУПА

ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ

Верасень 39-га

Развязаная нацысцкай Германіяй у верасні 1939-га года другая сусветная вайна з'явілася спробай вырашыць вострыя міжімперыялістычныя адносіны шляхам выкарыстання не толькі дыпламатыі, але і зброі.

Здрадніцтва Англіяй і Францыяй Польшчы, парушэнне імі дагаворных абавязацельстваў у адносінах да гэтай краіны з'явіліся лагічным працягам авантурнай палітыкі «калектыўнага неўмяшання» у справы агрэсара. Ваенныя дзеянні ўзброеных сіл Англіі і Францыі супраць вермахта Германіі насілі намінальны характар і ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «дзіўная вайна»: англійскія і французскія салдаты гулялі ў мяч, спалі, загаралі, не ствараючы бачнай патроны праціўніку. На Нюрнбергскім ваенным працэсе ў 1946 годзе генерал-фельдмаршал В. Кейталь заявіў, што «калі б Англія і Францыя сказалі нам «не!», мы б не выступілі». Імёны ваенная біяздейнасць гэтых дзвюх дзяржаў аб'ектыўна садзейнічала таму, што Германія ў верасні 1939 года не аказалася перад альтэрнатывай: альбо спыніць агрэсію супраць Польшчы, альбо працягваць не, але, у такім выпадку, сутыкнуцца з аб'яднанай англа-французскай ваеннай сілай. Аднак апошняга не адбылося. Палітыка заходніх дзяржаў стала трагедыяй для польскага народа.

Як і прадбачыў савецкі ўрад, Польская рэспубліка, якая адхіліла ваенную дапамогу СССР, перастала існаваць як самастойны дзяржаўны інстытут Еўропы. Урад краіны начале з прэм'ер-міністрам генералам Славой-Складоўскім, а таксама прэзідэнт Масьціцкі пакінулі Варшаву і пераехалі спачатку ў Люблін, а потым бліжэй да польска-румынскай граніцы і хутка ўцяклі ў Румынію.

19 верасня германскае войска скончыла польскую кампанію, хаця Варшава трымалася да 27 верасня, а старажытная крэпасць Мадлін і прыморскі порт Хель аказвалі супраціўленне да пачатку кастрычніка.

Сітуацыя змянялася, і Гітлер разумеў, што савецкі ўрад не застанецца абыкавым да далейшага дзеяння народаў

(Заканчэнне на 4-й стар.).

— Ай-ёй,— дзверы ціхенька рыпнулі, закрахталі і, нарэшце, ручка паддалася.

— Базылёк! — у адзін голас ускрыкнулі мы, убачыўшы лахматую галаву нашага старога знаёмага.

Дамавік ад агульнай увагі сумеўся і замармытаў:

— Я і не да вас. Я «вячэрнікаў» шукаю.

Якія там у яго справы з «вячэрнікамі», нам, зразумела, усё роўна, нас іншае непакоіла:

— Чаму доўгі час не заглядваў у госці?

— А вы спыталі, ці ёсць у мяне час? — разышоўся (па ўсім відаць — асвойтаўся) Базылёк.— Чаго я з даху спусціўся? Свету белага за гэтымі студэнтамі не бачу. Час «вольтавай дугі» надышоў. Сесія так націскае, экзамены так ненаконць. У паветры толькі дугавыя разрады і лётаюць, быццам студэнты табе электроды металічныя.

—Да фізікаў зазірнуў,— здагадаліся мы.

— І да лірыкаў таксама. Ім зараз не да вершаў. А ў вас тут даволі ўтульненька,— нарэшце азірнуўся ён па баках.— Раз, два, тры ...шэсць сталоў можна паставіць. Ці не зможаце аранджаваць фізфаку памяшканне? Хоць на час сесіі, каб дзве розныя групы два розныя залікі ў адной аўдыторыі не здавалі. А можа, ФПМ? На якім з-за малых плошчаў, катастрафічнага недахопу абсталявання і сучаснай вылічальнай тэхнікі студэнты вымушаны толькі што не на пальцах растлумачваць экзаменатару асновы праграміравання.

Наогул, сесія гэтая ўсё перабылтала. Ноч зрабіла днём, а дзень неклам. Там бачыш: не паспявае бедны студэнцік у тэрміны і хапае ротам паветра, якім, як вядома, перад смерцю не надыхаешся. Тут вучэбныя планы, здаецца, знарок заблыталі, каб прымусіць студэнтаў непатрэбныя курсы вывучаць.

У адной аўдыторыі выкладчык абураецца: «Як гэта мой прадмет ігнаруюць?!» У другой студэнт носам пакрыўджана круціць: «Спачатку за вольнае наведванне змагаліся, цяпер рахункі з намі зводзяць». Нехта і тройцы рады, а камусьці чацвёрка не да спадобы. Паспрабуй знайсці вінаватых, калі ніхто не ведае: бываюць аб'ектыўныя абазнакі ці не.

Тут Базылёк спыніўся:

— Што, прытаміліся? Гэта вам не паперкі пераклад-ваць.

І без цырымоній уладкаваўся ў крэсле:

— Нікуды адсюль не пайду, пакуль не адкажаце: чаму студэнт спісвае і чаму апошнім часам усё радзей зазірае ў бібліятэку?

НЕ ПУСТА, НЕ ГУСТА...

УЯЎЛЯЕЦЕ сабе, я прыйшоў у бібліятэку. Заказаў патрэбную кнігу і доўга чакаў, калі яе атрымаю. Праз некалькі гадзін замест дапаможніка пачуў адказ: «Кнігі няма на месцы». Вядома, абурыўся. Вядома, патрабаваў паклікаць дырэктара ці іншае мясцовае «начальства». Што думаеце? Знайшоўся. А потым гневу я да самага свайго шча данёс. Гэта ж трэба, каб у родная установе прымусілі мяне, старога, хвалявацца і так марна траціць час. Бедныя гэтыя студэнты. Яны, пэўна, таму і двоечнікі атрымліваюць, што ў чэргах стаяць не паспяваюць.

— Чакай, Базылёк! Ці задумваўся ты калі-небудзь над тым, што узровень абслугоўвання і ад нас самих у многім залежыць. Раней і я быў упэўнены, што мае прыходы ў бібліятэку — уласная справа. Але з часам пераканаўся ў адваротным.

Уяві сабе такую сітуацыю. Выкладчык прачытаў лекцыю. А на развітанне, як звычайна, назваў спіс літаратуры, якую абавязкова (ці па жаданню) трэба прачытаць па тэме. Як мяркуеш: што зробіць студэнт?

Пойдзе ў бібліятэку і пастараецца ўзяць кнігу дамоў ці, магчыма, пазнаёміцца з ёю ў чытальнай зале. Не сумнявайся, ня пазнаць нешта новае, узбагаціць свой мозг. Але зноў жа: веды абавязкова павінны быць прададзены. І ў якасці такога «прыладніка» павінен выступіць выкладчык. Атрымліваецца нешта накшталт замкнёнага кола, якое як ні круці, у цэнтры ўвагі пустое выкладчык. Вось ад кога, аказваецца, залежыць недахоп ці лішак свабодных месц у чытальных залах.

Ты вырашыў папрацаваць у чытальні? Не сумнявайся: гэта будзе. Семідзесятыя гады, калі чытальныя залы былі перапоўнены, прайшлі.

— Добра гэта ці дрэнна? — задумваецца дырэктар фундаментальнай бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна І. У. Арэхоўская.— Не ўпэўнена, што патрэбна біць ва ўсе званы. Па-першае, мы сталі жыць лепш, значна павысіўся дабрабыт людзей, і амаль у кожнай сям'і — нядрэнная бібліятэка (звычайна яе старэючыя камплектаваць так, каб былі, напрыклад, кнігі, якія ўваходзяць у школьную праграму і г. д.). Ды і ў сяброў і суседзяў — таксама. Так што карыстацца гэтымі падручнікамі больш зручна дзі і не будзе адказу, што кніга «на руках». Ёсць яшчэ адна магчымасць — кафедральныя і кабінетныя бібліятэкі. Ці не лепш накіравацца ў Ленінку ці Пушкінку?

Дарэчы, добрую ініцыятыву прапанавалі на геафаку. Тут вырашылі на кожнай кафедры ўдакладніць спіс літаратуры, неабходнай для работы студэнтам і гэтыя выданні пакінуць у сховішчах бібліятэкі. А бібліятэка, у сваю чаргу (спадзяёмся, такая магчымасць будзе), зможа лішнюю літаратуру прадаць. Каму? Ды хоць бы нам з вамі. Выручаныя грошы спатрэбляцца на набыццё новых кніг і развіццё сацкультбыту. Выдатная ідэя? Безумоўна. Толькі кіраўнікі астатніх факультэтаў чамусьці не спяшаюцца яе падтрымаць.

Як дапамагчы студэнту ў вучобе? — вось пытанне, над якім пастаянна думаюць супрацоўнікі бібліятэкі. Яны разумеюць, што галоўнае багацце студэнта — час, і стараюцца не дазваляць, каб яго разбазарваліся. Таму і прапанавалі выкладчыкам, якія лічаць сваіх лекцый галоўнай крыніцай ведаў, запісаць іх на плёнку і даць у чытальную залу (тут паклапацяцца б аб тым, каб іх размнажылі). Колькі часу сэканоміл бы студэнты, якім не трэба было б разбіраць ў тым, што напісаў ў спешцы, і выкладчыкі, у якіх адпала б патрэба паставіна паўтараць і чакаць, пакуль іх думкі будуць запісаны. А ўвесь «вызваленых» час можна было б выкарыстаць на работу з наглядным дапаможнікамі. Толькі зноў жа ў адказ на стук у дзверы — маўчанне.

Не вызначаюцца імкненнем да супрацоўніцтва і грамадзянскую (вось ужо зусім незразумелая пазіцыя!). Прыязныя прапанову работнікаў бібліятэкі дапамагчы ім у зборы матэрыялаў па той ці іншай тэматыцы з газет і часопісаў, яны аказалі б велізарную паслугу студэнтам, паспавяшчы іх неабходнасці рабіць гэта самім напярэдадні экзамена. Але... Пакуль бібліятэкарам даводзіцца займацца гэтым па ўласнай ініцыятыве, усяляную, не ведаючы дакладна, што патрэбна выкладчыкам.

Праўда, тут нельга сцвярджаць адназначна, бо ёсць выкладчыкі, якія перакананы, што ад супрацоўніцтва з бібліятэкай выйграюць усе: і студэнты, і выкладчыкі, і бібліятэка. Такой думкі прыдзельвающа прафесар гістфака Д. Б. Мельцер, дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў В. К. Кісялёў, выкладчыца гэтай жа кафедры Я. М. Асіпкова і інш. Толькі іх, на жаль, вельмі мала. А хацелася б, каб было больш.

Тады, магчыма, і чытальныя залы бібліятэк не былі б напаўпустымі.

Дамавік Базылёк скардзіўся
З. АЛЯШКЕВІЧ,
М. ДЗЯБЕЛУ.

ХТО ЯГО ВЕДАЕ, як тут знайсці галоўную дзеючую асобу? Выкладчык на нас зірнуў сурова паверх розных акуляраў: «Сустрэнемся пакінуць ў калідоры. Пасля пытанні задаю яв. А потым кінуў на стос залікавак: зразумелыя ж самі — сесія.

Студэнт прамовіў дрыжачым голасам: «Чамар трынацаць». І разгубіўся. Цяпер ад яго нічо не дабэшся. Нават калі ведае з аўдыторыі нішкай у гэтай на прыс сузд ёсць ява рэзка махнуць рукам скардзіцца або хваліцца — сесія.

Таму інтэрв'ю у нас не атрымалася. Так з вырашылі: галоўнае ў ча «вольтавай дугі» нікога не раніць, каб нікому не не ашкаджаць. А дзеючая асоб Вы дарэмна сумняваецеся. Не дапамогуць ні пас даніні сяброў, ні камп рныя шпаргалкі. Яе Вал асць Сесія такіх памылак ндарыце.

Фота С. ГРЫЦА.

ПЯЦЬ ІМГНЕННЯЎ

Шпаргалка № 1

«У час экзамена студэнты могуць карыстацца вучэбнымі праграмамі, а таксама, з дазволу экзаменатара, дадатковай літаратурай і іншымі дапаможнікамі. Цікавая фармулёўка, ці праўда? Бо пад «іншымі дапаможнікамі» можна разумець рэчы зусім розныя. Але ж мы з вамі зразумелі, ці не так?

Шпаргалка № 3

«Экзаменатару надаецца права задаваць студэнтам пытанні за межамі білета, з тэкстам, акрамя тэарэтычных пытанняў, даваць задачы і прыклады па праграме дзесяцігадовага курса».

Памятай, студэнт, — гэта права самога выкладчыка! І не абурайся, калі ты атрымаеш дадатковае пытанне, а нехта іншы — не. Можа, ён сапраўды лепш за цябе адказаў на асноўнае?

Шпаргалка № 5

«Знаходжанне на экзаменах і заліках пабочных асоб без дазволу рэктара вышэйшай навучальнай установы, прарэктара па вучэбнай рабоце або дэкана факультэта забараняецца».

Вось так. Болей не запрашайце сабе ў падтрымку на экзамене бацькоў і сваякоў. Таксама выкладчыкі, калі зайдуць да яго зойдзе які-небудзь добры знаёмы і захоча паслухаць ваш адказ. Толькі... Ці здолеце вы, дарагія слухачы, пасля ўсяго сказанага, калі напярэдадні экзамена ў рэктара ці дэкана, пасля ўсяго сказанага, калі напярэдадні экзамена ў рэктара ці дэкана, калі напярэдадні экзамена адпавесці? Цікава б было паглядзець на гэтакае...

Шпаргалка № 2

«Расклад састаўляецца з такім разлікам, каб на падрыхтоўку да экзамену па кожнай дысцыпліне было адведзена, як правіла, не менш 3—4 дзён».

Але ж студэнты ведаюць разлік не толькі на максімальную магчымасць дня. Ям рыхтуюцца ў гадзінах. Ясна ім, што ў гэтым сэнсе найгорш ставяцца тыя 4-га курса факультэта журналістыкі, напрыклад, так перастраліся ў гэтым сэнсе імкненні, што збіраюцца аж вучыць палітэканомію сацыялізма за 2(!) дні. Асабліва ім пазайздросціць у дапушчальным выпадку тым з іх, хто не семіпрад-

Шпаргалка № 4

«Пры з'яўленні на экзамены і заліку мець пры сабе дакумент, які пацвярджае асобу, і залікоўку, якія студэнт бу, у залікоўку, якія студэнт прад'яўляе экзаменатару ў пачатку экзамена».

Уяўляеце, таварышы, клапатлівасць «дарагіх» адказ ужо настойліва на экзаменах і заліках? Ці часта вы бачылі пашпарты разам з экзаменацыйнымі білетамі і залікоўкамі на стале выклад-



ПРАЗ ЗАМОЧНУЮ ШЧЫЛІНУ

Я не пранырa, я проста цікаўны. І хоць студэнцкае жыццё для мяне даўно ўжо не таямніца, здзіўляюцца даводзіцца ледзь не штодзень. Выпадкова завітаў на мехмат і прама ў калідоры перад аўдыторыі пачуў размову.

— Ты падрыхтаваўся?

— Так. Два дні патрацiў. Галава забіта формуламі, усе змяшаліся, як бы новую не вывесці з такога вінегрэту.

— Дзівак-чалавек. Ты б «бомбы» пісаў. Хіба ўсё ўпомніш. Вось глядзі і вучыся,— хлопец выняў з кішэні акуратна складзены «гармонік» і паказаў сябру.

Сакрэт «бомбы»

Не ведаю, чым скончылася іх размова, бо надышла чарга хлопцаў здаваць экзамен, але пачатак вельмі інтрыгуючы, таму мне захацелася разгадаць сакрэт «бомбы». З кага пачаць? З тых, хто прымяняе гэтую «зброю», ці з тых, супраць каго яна накіравана?

— А гэта адны і тыя ж людзі, Базылёк,— прамовіла, пачуўшы мае разважанні, А. Т. Дземідовіч — выкладчыца кафедры вылічальных метадаў і праграмірання.— Асабіста для мяне экзаменацыйны білет толькі повад, завязка для размовы. Таму спісаўшы адказ на пытанне па білету, студэнт наўрад ці здолеў мяне абмануць, хутчэй сябе ўвёў у ілюзію заўчаснай перамогі. Зрэшты, у мяне прадмет спецыфічны — праграмірванне. Можа супраць іншых выкладчыкаў гэта і сапраўды страшэнная зброя».

— Якая там «зброя». Не нападаць жа збірацца студэнт, абараняцца. Хто яго прымусіў? Абставіны. Ці можа звычайны нармальны чалавек ведаць усё, ды яшчэ на мехмаце, дзе адных формул не злічыш. Не, шпаргалка — гэта рэфлексія студэнта на празмерную загружанасць. Вось каб у час экзаменаў выкладчыкі дазволілі канспектам карыстацца, тады б і «махляваць» не давялося,— на адным дыханні выпаліў студэнт-завочнік Саша Марозаў.

— А чаму б не? Калі ласка, я дазваляю,— даведуўшыся, у чым справа, міралюбіва заявіў дацэнт кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі матэматыкі В. У. Балашчанка.— Важна не столькі запомніць, сколькі зразумець. Не бяда, калі прыдасца студэнт забуўся якую-небудзь формулу, а ў матэрыяле разбіраецца добра. За «падглядкаў» у канспект я нават адзнакі не зніжаю. А за карыстанне «бомбай» прапаную размову на больш шырокую тэму, чым у білеце. Аднак хоць у многіх выпадках такі метад барацьбы са спісваннем вельмі эфектыўны, цалкам дасягнуць стопрацэнтнай сумленнасці пакуль што не ўдалося.

Што ж, пайду пашукаю. Можа хто з выкладчыкаў і падрыхтаваў сродкі абароны ад масавай «бамбардзіроўкі». «Кафедра дыферэнцыяльных ураўненняў». Вось тут, напэўна, здолеюць выразіць задачу з адным невядомым.

— Не з адным, а з двума,— папраўіў мяне дацэнт кафедры У. Р. Скапцоў.— Першы невядомы X — студэнт-лайдак. Не хоча вучыцца на працягу семестра, вось і імкнецца ў час экзамену спісаць. Другі — У. Тып больш складаны і старанны. Шпаргалкамі, як правіла, запасаецца для смеласці, падстрахоўкі: а раптам здарыцца, што патрэбная формула неяк выскачыць з галавы. Праўда, мае адносіны да іх адносна невялікія. «Бомбу» забіраю. Раней адпраўляў з аўдыторыі давучаць, зараз... Зараз спрабую яшчэ праверыць ведамасці на іншых тэмах курсу, тады і выстаўляю адпаведную адзнаку.

— Адзнака,— галоўны «стымул» спісваючага,— падключаецца да нашай размовы дацэнт гэтай жа кафедры В. І. Мататаў.— Таму адносіны да несумленных студэнтаў у мяне адмоўныя. Заявіўшы за спісаннем, я адразу ж забіраю і шпаргалку, і білет. Даю шанц выправіць становішча, апытваю па іншым білеце, але больш патрабавальна і менш даверліва.

— Так, шмат выкладчыкаў, Базылёк, якім лепш не трапляцца на вочы са шпаргалкай,— паскардзілася адна дзяўчына.— Самі не разумеюць, што як выкладаюць, так і вучым. Патрабаваць, вядома, не цяжка, куды складаней навучыць проста, цікава і даходліва,— кінула яна камень у бок дэканата і развіталася, не назваўшы свайго імя — сесія яшчэ наперадзе, і не адна.

Вось незадача, вось адкрыццё. Адна бяда паваяла за сабой і другую. Так яны і ідуць абедзве, ад сесіі да сесіі, і ў час сесіі. Лёгка і зручна ім, бо заўсёды адна адну могуць апраўдаць. Маўляў, навошта вучыць, а раптам не спатрэбіцца ў жыцці. Не, лепш спішу. І наадварот: спісваю таму, што прадмет хутчэй за ўсё другарадны. Ледзь галава не трэснула ад такога «куралесся» думак. А ці толькі ў мяне адназго яна павінна балець ад пытання: «Чаму студэнт спісвае?» Даўно час задумацца над гэтай праблемай і выкладчыкам, і студэнтам, і кіраўніцтву факультэтаў (хвароба гэта не мехматаўская, падобную з'яву можна сустрэць на любым факультэце). Рэцэпт ад спісвання павінны складаць і «дактары», і «пацыенты». Тады і размова на экзамене атрымаецца шчырая, даверлівая і дзелавая. А ў далейшым жыцці не давядзецца нарабіць на родную «альма матэр».

АДКРЫВАЕМ АМЕРЫКУ

«Я вывучаў вашу гісторыю, але не ведаю вас асабіста»

ТАК СКАЗАЎ НАВУЧЭНЕЦ АМЕРЫКАНСКАГА КАЛЕДЖА НА СУСТРЭЧЫ, ЯКАЯ АДБЫЛАСЯ Ў НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ 12 СТУДЗЕНЯ.

Амерыканскія хлопцы і дзяўчаты знешне нічым асаблівым не вылучаліся.

Стрымана размаўляючы паміж сабой, яны абышлі залы музея гісторыі універсітэта, потым пажадалі наведаць аўдыторыі і, нарэшце, былі запрошаны ў адну з іх — 206-ю. Тут пачалася афіцыйная частка сустрэчы.

Адзіны сярод навучэнцаў амерыканскіх каледжаў выкладчык прызнаўся, што галоўная мэта іх паездкі па Савецкаму Саюзу — як мага больш даведацца аб ім з гістарычнага, палітычнага і эканамічнага пунктаў гледжання. Акрамя Мінска, група ўжо наведала Маскву і Кіеў, а напярадзе яшчэ сустрэча з Ленінградам.

...Большасць пытанняў за імправізаваным круглым сталом задавалі амерыканцы. Гэта выглядала натуральна не толькі таму, што гасцямі былі яны, а больш за ўсе з-за колькасных суадносін паміж удзельнікамі размовы: нашых студэнтаў было недзе ў два разы менш, чым іх замежных субяседнікаў.

Пытанні гучалі разнастайныя, але адчувалася, што шукаюцца яны тут жа, у ходзе размовы, а не падрыхтаваны загадзя. Да таго ж, наклала свой адбітак прыкметная стомленасць гасцей — амаль што перад самай сустрэчай ва універсітэце яны пакінулі цягнік.

— Колькі гадоў патрэбна вам вучыцца? Якая розніца паміж універсітэтам і інстытутам? Ці многа універсітэтаў у Савецкім Саюзе? Ці мае ў вас прэстыж прафесія ўрача? Ці існуе канкурэнцыя сярод студэнтаў? Як адбілася перабудова на дзейнасці выкладчыкаў?

Нашы студэнты не адразу перайшлі ад адказаў да сваіх пытанняў:

— Як змянілася ваша ўяўленне аб Савецкай краіне за час знаходжання тут?

Адзін з амерыканцаў адказаў:

— Я не ведаў, чаго чакаць, калі збіраўся да вас. Здабываю ўражанні ў дарозе.

Другі прызнаўся, што за некалькі дзён паездкі даведаўся аб нашай краіне больш, чым за ўсё сваё папярэдняе жыццё.

Быў і агульны, дружны адказ гасцей. Працяглае «Йе-э-эс» («да» па-англійску) прагучала ў адказ на пытанне: ці хочаце вы, каб зніклі ўсе перашкоды паміж нашымі краінамі?

Яшчэ гаварылі пра свае надзеі на чарговага прэзідэнта Дж. Буша і жаданне ведаць ўсё пра нашых людзей: дзе яны абедаюць, як уваходзяць у метро...

Гутарка абарвалася нечаканымі словамі гіда: «Час спыняцца — нам трэба ехаць на абед».

Прыйшлося развітвацца. Прыкметным акцэнтам (больш складанае для вымаўлення слова) дадавалі: «До свидания!»

І сапраўды, няхай бы яна адбылася — яшчэ адна сустрэча з гэтымі маладымі людзьмі. Толькі няхай яна будзе мець крыху іншую афарбоўку. Мы ж даўно ўжо не глядзім на жыхароў Злучаных Штатаў, як на восьмае цуда свету. Дык можа не трэба больш саджаць іх на роўныя рады крэслаў і ствараць для размовы афіцыйную абстаноўку? Замест простай, чалавечай — з чаем і вольнымі гутаркамі?

Зразумела, гэта няпроста. Тым больш, калі адведзены вельмі абмежаваны час. Але менавіта чалавечыя зносіны маюць самую вялікую каштоўнасць і пакідаюць самы значны след. Гэта вельмі востра адчувалася, калі студэнты двух краін са шчырымі ўсмешкамі абменьваліся поціскамі рук...

Увесь час размаўлялі з дапамогай перакладчыка, а тут сталі абыходзіцца без яго — усё было зразумела. Бо адно слова з рускай мовы амерыканскія студэнты ведалі і паўтаралі яго ўсім прадстаўнікам універсітэта, якія ўдзельнічалі ў сустрэчы, паціскаючы пры гэтым руку: «Спасибо!» А некаторыя з

У час сустрэчы прысутнічала
В. БЯГУН,
наш кар.

Фота С. ГРЫЦА.

ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ

Верасень 39-га

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, тэрыторыі якіх з 1921 года ўваходзілі ў састаў Польшчы. Імкнучыся высветліць пазіцыю СССР, ён 3 верасня ў прысутнасці міністра замежных спраў Рыбентропа прыняў новага савецкага паўнамоцнага прадстаўніка Шкварцава і ваеннага аташэ Пуркаева. Гітлер паставіў пытанне прама: ці збіраецца савецкі ўрад увесці свае войскі на гэту тэрыторыю і ці не жадае пракансультавацца наконт гэтага з Германіяй? Савецкія прадстаўнікі, пасля таго як атрымалі інструкцыю з Масквы, далі адмоўны адказ. 8 верасня Шкварцава прыняў Рыбентроп, які заявіў, што «палякі спынілі арганізаванае супраціўленне супраць германскага войска» таму «фюрэру хацелася б вызначыць пазіцыю СССР у адносінах пэўных раёнаў». Адказ быў атрыманы 10 верасня, калі В. М. Молатаў запрасіў да сябе германскага пасла графа Ф. Шуленбурга і заявіў яму, што калі савецкія войскі і выступяць, то для таго, каб абараніць заходніх беларусаў і украінцаў. «Польшча развальваецца, СССР вымушаны прыйсці на дапамогу украінцам і беларусам», — заявіў глава савецкага ўрада. Тым самым Германіі далі зразумець, што Савецкі Саюз не дапусціць нямецкай акупацыі гэтых рэгіёнаў. У гэты ж дзень урад СССР прыняў рашэнне аб частковым прызыву ў Чырвоную Армію моладзі некалькіх узростаў, у тым ліку на тэрыторыі Украіны і Беларусі. Для Германіі стала зразумелым, што Савецкі Саюз збіраецца пачаць вызваленчы паход у заходнія раёны.

Папярэдзіўшы Германію аб намеры вызваліць прыгнечаныя адзінакроўныя народы, савецкае кіраўніцтва аддало распараджэнне Галоўнаму Камандаванню Чырвонай Арміі аб пераходзе нашымі войскамі граніцы і ўзяцці пад сваю абарону жыцця і маёмасці насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Ранкам 17 верасня савецкія войскі перасеклі граніцу СССР і ўступілі на тэрыторыю Польшчы. Некаторыя заходнія буржуазныя гісторыкі сцвярджаюць, што СССР прадпрыняў акт агрэсіі супраць Польскай рэспублікі. Але гэта не адпавядае рэчаіснасці. У гэты дзень, калі войскі Савецкага Саюза павінны былі пераступіць граніцу, польскаму паслу ў Маскве Гржыбоўскаму была ўручана нота, у якой СССР папярэджваў урад Польшчы аб сваіх намерах. Такія ж ноты былі ўручаны паслам усіх дзяржаў, з якімі Савецкі Саюз падтрымліваў дыпламатычныя адносіны, у тым ліку і германскаму паслу.

Акцыя СССР сустрэла падтрымку ва ўсім свеце. Ні адна з заяў палітычных дзеячаў Еўропы не выказвала асуджэння дзеянням Савецкага Саюза. І Германія вымушана была лічыцца з тым, што адбылося. 17 верасня Гітлер заявіў, што «СССР з факта распаду польскай дзяржавы зрабіў упаўне правамерныя вывады — ахоўваць уласнай сілай блізкія яму нацыянальныя меншынствы ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі».

Увод савецкіх войск праходзіў тады, калі як вынік поўнай дэзарганізацыі польскай дзяржаўнай машыны перасталі існаваць усе дагаворы, заключаныя паміж СССР і Польшчай. Савецкі Саюз з гэтай нагоды не мог больш заставацца нейтральным у адносінах да германа-польскай вайны. Аднак ён не далучыўся ні да адной з ваюючых краін. «СССР,— пісаў начальнік генштаба ўзброеных сіл Германіі генерал-палкоўнік Л. Бек,— не ідзе на повадзе Германіі, а шукае ўласную выгаду».

19 верасня савецкія войскі авалодалі Владзімір—Валынскам, пераадольваючы пры гэтым супраціўленне, аказанае ім з боку некаторых польскіх фарміраванняў, а 22 верасня — Брэст—Літоўскам. На гэты час нямецкія войскі, якія акупіравалі горад, атрымалі загад пакінуць яго. Для таго, каб зафіксаваць становішча, якое склалася ў той час, неабходна было ўстанавіць дэмаркацыйную лінію паміж савецкімі і нямецкімі часцямі. І яна была ўстаноўлена ў савецка-германскім камюніке 22 верасня. Лінія праходзіла па рацэ Піса да таго месца, дзе яна ўпадае ў раку Нараў, потым да ўпадзення апошняй у Буг, па Бугу да таго месца, дзе ён упадае ў Віслу, па Вісле, да ўпадзення ў раку Сан і потым да яе вытокаў. Гэта дэмаркацыйная лінія праходзіла ў асноўным па «лініі Керзана», вызначанай яшчэ Версальскай канферэнцыяй 1919 года. Савецкі Саюз пацвердзіў, што ён не меў ніякіх агрэсіўных, экспансіянісцкіх планаў уласна супраць Польшчы. У. Чэрчыль, якога не папракнеш у сімпатыях да Савецкага Саюза, адзначаў: «Тое, што рускія арміі павінны былі знаходзіцца на гэтай лініі, было неабходна для небяспекі Расіі супраць нямецкай пагрозы». СССР адразу пачаў на ёй будаўніцтва паласы абароны, даўшы гэтым зразумець Германіі, што намерам нацыстаў у адносінах Балтыйскіх дзяржаў, Украіны, Беларусі павінен быць пакладзены канец.

24 верасня ў міністэрстве замежных спраў Германіі паўнамоцны прадстаўнік СССР А. А. Шкварцаў і статс-сакратар Э. Фон Вейцзекер абмяняліся граматамі аб ратыфікацыі дагавору аб ненападзенні ад 23 жніўня. Дагавор, такім чынам, быў ратыфікаваны толькі пасля таго, калі пасляверсальскай польскай дзяржавы больш не існавала, а Еўропа надоўга пагрузілася ў бяздонне новай сусветнай вайны. СССР яшчэ раз прадэманстраваў свой прынцып — не даваць заходнім дзяржавам нават самай малой зачэпкі для ідэалагічнай правакацыі.

Аднак паміж дзвюма краінамі не было заканадаўча ўсталяванай дзяржаўнай мяжы. Існуючая з 22 верасня дэмаркацыйная лінія не магла адказваць патрабаванням бакоў. Заклапочаны магчымымі правакацыямі, савецкі ўрад прапанаваў ураду Германіі устанавіць дзяржаўную граніцу. 27 верасня, калі Варшава была акупіравана германскімі войскамі, у Маскву прыбыў фон Рыбентроп.

Вынікам яго візіту з'явіўся падпісаны 28 верасня «Савецка-германскі дагавор аб дружбе і граніцы», які, здавалася, назаўсёды гарантаваў дружбу, добрасуседскія адносіны паміж дзвюма дзяржавамі. Ён ператвараў дэмаркацыйную лінію ў савецка-германскую лінію па рубяжу: Сянкі, Перамышль, Ярослаў, Хрысцінопаль, Брэст-Літоўск, Астраленка, Аўгустаў, Вільня.

Дагавор з'явіўся стабілізуючым фактарам, які стрымліваў Германію ад адкрытых правакацый на заходняй савецкай граніцы. Разам з пактам ад 23 жніўня ён пашыраў магчымасці СССР у набыцці ў Германіі неабходных яму матэрыялаў, тэхналогій, абсталявання, якія нельга было набыць у той час на іншых рынках (з-за адсутнасці паўнакроўных эканамічных сувязей з Англіяй і Францыяй), што не магло не садзейнічаць інтэнсіўнаму развіццю прамысловасці СССР, у тым ліку і ваеннай.

У адпаведнасці з дагаворам у кастрычніку 1939 года абодвума бакамі была с[illegible]дзена эканамічная праг[illegible]дзе Савецкі Саюз аба[illegible]ваўся пастаўляць Герм[illegible] сыравіну ў абмен на прамысловыя тавары. СССР паказаў усім, у тым ліку Англіі і Францыі, што ён мяркуе і ў стане цвёрда адстойваць свае інтарэсы, праводзіць уласны курс у сусветных справах.

Аднак у дагавора былі і негатыўныя бакі. Атрымаўшы агульную з нацысцкай Германіяй граніцу, СССР наблізіў да сваіх рубяжоў небяспеку вайны. Хутка пасля яго заключэння пачалася канцэнтрацыя фашысцкіх войск у раёнах, якія мяжуюць з СССР.

З другога боку, дагавор завяршыў падзенне прэстыжу СССР у сусветным камуністычным і рабочым руху, пачатак якому паклаў пакт ад 23 жніўня. Камінтэрн быў проста аглушаны словам «дружба». Арыентаваўшы камуністаў і рэвалюцыйных рабочых на фарміраванне адзінага і шырокага народнага фронта як міжкласавага саюза сіл, выступаўшых супраць фашызму, ён быў д[illegible]зарыентаваны ідэалагічн[illegible]. Сталін не бачыў неабходнасці ў тым, каб праінфармаваць аб сапраўдных мэтах, якія меў на ўвазе ўрад, заключаючы дагавор, бо, як адзначыў М. С. Гарбачоў, нават важнейшыя рашэнні прымаліся вузкім колам асоб, без калектыўнага разгляду і аналізу, што прыводзіла да неадэкватнай рэакцыі на міжнародныя падзеі.

Пасля заключэння дагавору «Аб дружбе і граніцы» савецкая прапаганда; сродкі масавай інфармацыі рэзка змянілі адносіны да фашызму ад крытычных да нейтральных. У выніку — сур'ёзныя ідэалагічныя страты. Дагавор духоўна разбройваў савецкіх людзей, якія ненавідзелі фашызм (да сярэдзіны 1939 года савецкі друк паведамляў аб зверствах нацыстаў у Германіі і за яе межамі) і разумелі, што гэта вайна, зло, а савецкая прапаганда заклікае прымірыцца з гэтым злом.

Няўдалыя палітыка-ваенныя перагаворы з Англіяй і Францыяй (у нейкай ступені па віне СССР) прымусілі нас пайсці на кантакты з Германіяй. Іншага выхаду ў Савецкага Саюза не было. Калі б СССР восенню 1939 года аказаўся б толькі пасіўным назіральнікам, то ўсходняя граніца Германіі, магчыма, аказалася б амаль пад Мінскам. Узрасла б небяспека вайны для СССР. І ў зн[illegible] на большай ступені, чы[illegible] выніку заключэння 28 верас[illegible] яшчэ аднаго палітычнага дагавору з Германіяй.

С. ТАЛЯРОНАК,
студэнт V курса
гістарычнага факультэта.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
19 студзеня.
Зак. 1609.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.